ГА «БЕЛАРУСКАЯ
АСАЦЫЯЦЫЯ
ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

# СМІ
# Ў БЕЛАРУСІ

ЭЛЕКТРОННЫ
БЮЛЕТЭНЬ

2013

## Выніковы аналітычны агляд



# ЗМЕСТ:

**Медыя-ландшафт Беларусі – 2013 . . . . . . . . . . . 3**

**Развіццё сітуацыі ў сферы СМІ
ў Беларусі ў 2013 г. (агляд) . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5**

**Рэйтынгі, індэксы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8**

# МЕДЫЯ-ЛАНДШАФТ БЕЛАРУСІ – 2013

Паводле дадзеных Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь на 1 студзеня 2014 года ў краіне было зарэгістравана 1556 друкаваных сродкаў масавай інфармацыі (712 газетаў, 793 часопісы, 38 бюлетэняў, 11 каталогаў і 2 альманахі), з якіх, як часта падкрэсліваюць афіцыйныя асобы, дзяржаўнымі з'яўляюцца толькі 410.



Аднак абсалютная большасць з недзяржаўных друкаваных СМІ з'яўляюцца забаўляльнымі, рэкламнымі і да т.п. Зарэгістраваных недзяржаўных СМІ грамадска-палітычнай скіраванасці, па падліках грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя журналістаў», – менш за 30. Амаль палова з іх яшчэ ў 2005 г., напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў 2006 г., была выкінутая з дзяржаўных сетак распаўсюду газетаў па падпісцы і ў розніцу і дагэтуль у іх не вернутая; многія (асабліва нацыянальныя выданні) маюць цяжкасці з атрыманнем рэкламы. Штодзённы наклад газеты Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Савецкая Беларусія» ў два разы перавышае сукупны тыднёвы наклад незалежнай прэсы (большасць з недзяржаўных газетаў выходзяць раз у тыдзень). Астатнія дзяржаўныя друкаваныя выданні маюць наклады, параўнальныя з накладамі незалежнай прэсы, але выбудаваныя ў жорсткую ідэалагічную вертыкаль.

Выхаду на рынак традыцыйных СМІ новых паспяховых грамадска-палітычных праектаў не назіралася – пры тым, што за 2013 г. Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь зарэгістравала 88 друкаваных СМІ. Газетаў з іх – толькі 26, а большасць зарэгістраваных за год выданняў – часопісы камерцыйнай накіраванасці. За гэты ж перыяд міністэрства анулявала пасведчанні пра рэгістрацыю 13 друкаваных сродкаў масавай інфармацыі (з іх – 5 газетаў).

**Рэгістрацыя СМІ, у тым ліку і друкаваных, у Беларусі ажыццяўляецца органам дзяржаўнага кіравання (Міністэрствам інфармацыі) у дазволь-**

**ным парадку. За 2010–2012 гг., паводле словаў міністра інфармацыі Алега Праляскоўскага, Міністэрства інфармацыі накіравала заснавальнікам СМІ 105 адмоваў у рэгістрацыі СМІ.**



Сітуацыя з тэлевізійнымі і радыёвяшчальнымі СМІ ў Беларусі яшчэ менш адпавядае дэмакратычным стандартам. З 262 зарэгістраваных на пачатак 2014 г. тэлерадыёпраграмаў (169 з якіх – радыёпраграмы) пераважная большасць (178) – дзяржаўныя (з іх 144 радыё- і 34 тэлепраграмы). Але і астатнія 84 недзяржаўныя электронныя СМІ знаходзяцца пад поўным кантролем уладаў з прычыны сістэмы ліцэнзавання (альбо “рэгістрацыі”) вяшчання.

На працягу 2013 г. былі зарэгістраваныя 3 новыя радыёпраграмы і 4 – тэлепраграмы, фактычна палова з якіх (3) – дзяржаўныя.

Акрамя таго, у краіне зарэгістравана 9 інфармацыйных агенцыяў, 7 з якіх – фармальна недзяржаўныя.

Эканамічная і прававая дыскрымінацыя незалежных СМІ ажыццяўляецца на тле адміністрацыйных прэферэнцыяў і прамой бюджэтнай падтрымкі дзяржаўных медыяў. У 2013 г. на фінансаванне СМІ, якія падтрымлівае дзяржава, рэспубліканскім бюджэтам было вылучана каля 60 млн. еўра. Грошы былі размеркаваныя на пазаконкурснай аснове. Нацыянальная дзяржаўная тэлерадыёкампанія, а таксама дзяржаўныя тэлеканалы СТВ («Сталічнае тэлебачанне») і АНТ («Другі нацыянальны тэлеканал») у чарговы раз былі вызваленыя ад выплаты падаткаў на дададную вартасць і на прыбытак.

Самым вольным сектарам інфармацыйнай прасторы Беларусі застаецца інтэрнэт. Больш чым 4,85 млн. беларусаў ва ўзросце ад 15 гадоў карыстаецца інтэрнэтам (што на 12% больш, чым годам раней); прыблізна 80% з іх робяць гэта штодзень.



Аднак свабода дзейнасці ў Байнэце паступова абмяжоўваецца як прававымі, так і неправавымі метадамі.

# РАЗВІЦЦЁ СІТУАЦЫІ Ў СФЕРЫ СМІ Ў БЕЛАРУСІ Ў 2013 ГОДЗЕ
## (агляд)

У 2013 г. сітуацыя ў сферы СМІ ў Беларусі знаходзілася ў стане стагнацыі, застаючыся скрайне неспрыяльнай для свабоды выказвання меркаванняў.

Асноўныя пазітыўныя падзеі медыйнага года адбыліся ў яго пачатку. Былі спыненыя крымінальныя справы супраць журналістаў Андрэя Пачобута і Антона Сурапіна і адмоўлена ва ўзбуджэнні крымінальнай справы ў дачыненні да пасадовых асобаў часопіса “Arche. Пачатак” . Гэтыя канфлікты знаходзіліся ў цэнтры ўвагі міжнароднай грамадскасці, і іх вырашэнне можа сведчыць пра спробы афіцыйнага Мінска разблакаваць адносіны з Еўразвязам пасля поствыбарнага крызісу канца 2010–2012 гг.



Гродзенскі карэспандэнт польскай «Gazety Wyborczej» Андрэй Пачобут абвінавачваўся па ч. 2 арт. 367 КК (паклёп у дачыненні да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, здзейснены асобай, якую раней судзілі за паклёп) у тым, што ў шэразе яго публікацыяў у інтэрнэце “ўтрымліваліся паклёпніцкія выказванні ў дачыненні да кіраўніка дзяржавы”. 21 чэрвеня 2012 г. А.Пачобут быў затрыманы і змешчаны пад варту, а ў яго кватэры быў праведзены вобшук. 30 чэрвеня журналіста вызвалілі пад падпіску аб нявыездзе. Справа ўскладнялася тым, што ўлетку 2011 г. Пачобут ужо быў асуджаны за паклёп у адносінах да прэзідэнта да трох гадоў пазбаўлення волі з адтэрміноўкай выканання прысуду на два гады, і любы абвінаваўчы прысуд па новай справе цягнуў бы за сабой 3 гады рэальнага пазбаўлення волі па папярэдняй справе. Аднак 15 сакавіка Упраўленне Следчага камітэта па Гродзенскай вобласці спыніла крымінальную справу супраць яго ў сувязі з адсутнасцю складу злачынства.

Праз тыдзень пасля спынення крымінальнай справы ў дачыненні да А.Пачобута, 22 сакавіка, стала вядома пра адмову ва ўзбуджэнні крымінальнай справы па выніках праверкі рэдакцыі часопіса "Arche. Пачатак". Праблемы ў часопіса пачаліся ўвосень 2012 г., калі на прэзентацыі кнігі "Саветызацыя Заходняй Беларусі" супрацоўнікі міліцыі і падатковай інспекцыі затрымалі галоўнага рэдактара "Arche. Пачатак" Валерыя Булгакава і абвінавацілі яго ў незаконнай прадпрымальніцкай дзейнасці. Фінансавыя органы пачалі маштабную праверку дзейнасці рэдакцыі часопіса, заблакавалі рахунак рэдакцыі часопіса, на дзяржаўным тэлебачанні з'явіліся прапагандысцкія ролікі, у якіх вядучы заявіў, што "кніжная справа" можа перайсці ў крымінальную з-за экстрэмісцкага зместу канфіскаванай у рэдактара літаратуры. Валерый Булгакаў пад пагрозай крымінальнага пераследу быў вымушаны пакінуць Беларусь і вярнуўся толькі пасля таго, як кантралюючыя органы абвясцілі, што крымінальныя справы ў дачыненні да В.Булгакава і супрацоўнікаў часопіса ўзбуджацца не будуць.






Пра спыненне крымінальнага пераследу А.Сурапіна КДБ афіцыйна аб'явіў у чэрвені 2014 г. 20-гадовы студэнт Інстытута журналістыкі БДУ Антон Сурапін абвінавачваўся ў саўдзеле ў незаконным перасячэнні дзяржаўнай мяжы Рэспублікі Беларусь арганізаванай групай асобаў. Нагодай для абвінавачвання паслужыла тое, што ён першым выклаў на сваім сайце фотаздымкі плюшавых мішак з лозунгамі ў падтрымку дэмакратыі, якіх скінулі на тэрыторыі Беларусі са шведскага аднаматорнага самалёта, што парушыў мяжу 4 ліпеня 2012 г. Журналіст быў затрыманы і змешчаны ў следчы ізалятар КДБ, дзе правёў больш за месяц. З СІЗА КДБ Сурапіна выпусцілі ў жніўні 2012 г., аднак да спынення справы ён знаходзіўся пад следствам. Арышт Сурапіна ўзначаліў дзясятку самых абсурдных арыштаў 2012 г. у рэйтынгу Amnesty International.

Аднак гэтыя пазітыўныя крокі не суправаджаліся сістэмнымі зменамі ў сферы СМІ. Наадварот, прадпрымаліся меры рэпрэсіўнага характару ў адносінах да СМІ і журналістаў.

Супрацоўнікі міліцыі неаднаразова затрымлівалі журналістаў пры ажыццяўленні імі прафесійных абавязкаў, пракуратура і КДБ выносілі ў адрас фрылансераў папярэджанні за супрацоўніцтва з замежнымі СМІ. На працягу 2013 г. Беларуская асацыяцыя журналістаў зафіксавала больш за 50 выпадкаў затрымання журналістаў, 4 з якіх завершыліся адміністрацыйнымі арыштамі на тэрмін ад 3 да 12 сутак, і як мінімум 10 выпадкаў вынясення журналістам афіцыйных папярэджанняў.

Узмацнілася выкарыстанне заканадаўства аб супрацьдзеянні экстрэмізму для падаўлення свабоды выказвання меркаванняў. Так, у красавіку па заяве Упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці суд Ашмянскага раёна прызнаў экстрэмісцкімі матэрыяламі фотаальбом "Прэс-фота Беларусі 2011". Спасылаючыся на гэтае судовае рашэнне, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у верасні пазбавіла ліцэнзіі выдавецтва "Логвінаў", якое з'яўляецца адным з флагманаў беларускага незалежнага кнігавыдання. У канцы года стала вядома пра яшчэ некалькі спробаў уладаў прызнаць кніжную прадукцыю экстрэмісцкімі матэрыяламі.




**Фотаальбом "Прэс-фота Беларусі 2011" выдадзены па выніках конкурса прэс-фатаграфіі Беларусі, які праводзіцца з 2010 г.; у журы конкурса ўваходзяць вядомыя фатографы з розных краінаў. Альбом быў надрукаваны ў 2012 г. і вольна прадаваўся ў краіне. Фотаздымкі з альбома (фіналісты фотаконкурса) без якіх-колечы негатыўных наступстваў публікаваліся ў беларускіх перыядычных выданнях і размяшчаліся ў стужках інфармацыйных агенцыяў.**

У 2013 г. працягнулася практыка пераследу і прыцягнення да адказнасці блогераў і іншых інтэрнэт-актывістаў. Незалежныя інтэрнэт-рэсурсы перыядычна сутыкаліся з блакіроўкай, хакерскімі атакамі і да т.п. Некалькі інфармацыйных рэсурсаў уключаныя ў "чорны спіс" сайтаў, доступ да якіх абмяжоўваецца ў дзяржаўных арганізацыях, установах адукацыі і культуры.

У канцы 2013 г. намеснік міністра інфармацыі заявіў, што рыхтуюцца змены ў заканадаўства аб СМІ з тым, каб распаўсюдзіць яго палажэнні (аж да адклікання рэгістрацыі) на “найбольш папулярныя і ўплывовыя інтэрнэт-рэсурсы”. Гэтая заява выклікала негатыўную рэакцыю ў журналісцкім асяродку і інтэрнэт-супольнасці.




Беларускія і міжнародныя арганізацыі і структуры неаднаразова заклікалі прывесці заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы СМІ ў адпаведнасць з дэмакратычнымі стандартамі. Аднак прававыя акты, прынятыя ў Беларусі ў 2013 г., не сведчаць пра магчымую дэмакратызацыю сферы СМІ ў Беларусі. Хутчэй наадварот: яны паказваюць імкненне ўладаў узмацніць кантроль за свабодай выказвання меркаванняў і за межамі традыцыйных медыяў – у інтэрнэце і кніжным сектары (у ліпені 2013 г. набыў моц новы закон “Аб выдавецкай справе ў Рэспубліцы Беларусь”, які прадугледжвае рэгістрацыю Міністэрствам інфармацыі выдаўцоў кніг, тыпаграфіяў, а таксама распаўсюднікаў кніжнай прадукцыі).

# РЭЙТЫНГІ, ІНДЭКСЫ

У дакладзе праваабарончай арганізацыі Freedom House пра свабоду інтэрнэту ў 2013 годзе Беларусь аднесеная да краінаў з несвабодным інтэрнэтам.

У даклад Freedom House ўключаныя 60 краінаў. З іх 29 блакавалі ці фільтравалі ў інтэрнэце інфармацыю палітычнага і сацыяльнага характару. Беларусь з’яўляецца адзінай краінай у Еўропе, дзе свабода інтэрнэту абмяжоўваецца. Сітуацыю ў нашай краіне, на думку праваабаронцаў Freedom House, можна параўнаць з Кітаем, Суданам, Эфіёпіяй.

У іншым дакладзе Freedom House “Свабода прэсы 2013”, апублікаваным напярэдадні Сусветнага дня свабоды друку 3 мая 2013 г., Беларусь аднесеная да васьмі “найгоршых з горшых” краінаў, у якіх

“незалежныя СМІ не існуюць ці ледзьве здольныя працаваць, прэса выступае ў якасці рупара рэжыму, доступ грамадзянаў да аб’ектыўнай інфармацыі жорстка абмежаваны, нязгода падаўляецца пры дапамозе турэмнага зняволення, катаванняў і іншых формаў рэпрэсій”. Беларусь у рэйтынгу Freedom House займае 193 месца са 197 і суседнічае з Экватарыяльнай Гвінеяй, Эрытрэяй, Іранам, Кубай, Узбекістанам, Туркменістанам і Паўночнай Карэяй. Паводле шкалы, у якой “0” – найлепшая сітуацыя, а “100” – найгоршая, Беларусь атрымала 93 балы. Спасылка 1, спасылка 2, спасылка 3.

У 2013 г. Беларусь заставалася апошняй па ўзроўні свабоды СМІ ў краінах Усходняга партнёрства. Гэта выцякае з вынікаў трох штоквартальных вымярэнняў Індэксаў свабоды медыя ў краінах Усходняга партнёрства.

**Даследаванне праводзіцца ў межах праекта ENP EaP Media Freedom Watch на аснове апытанняў дзесяці медыяэкспертаў у кожнай з шасці краінаў Усходняга партнёрства: Азербайджане, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Малдове і Украіне. Індэкс вызначае ступень выканання асноўных правоў і свабодаў журналістаў у рэгіёне.**

REPORTERS WITHOUT BORDERS FOR PRESS FREEDOM

У традыцыйным штогадовым Сусветным індэксе свабоды прэсы, абнародаваным арганізацыяй “Рэпарцёры без межаў” у пачатку 2014 г., Беларусь, як і ў мінулым годзе, заняла 157-е месца са 180. З былых краінаў Савецкага Саюза ніжэй за Беларусь у рэйтынгу арганізацыі апынуліся не толькі Казахстан, Узбекістан і Туркменістан, але і Азербайджан (160), якія год таму знаходзіўся на 156-м месцы.

ГА «БЕЛАРУСКАЯ
АСАЦЫЯЦЫЯ
ЖУРНАЛІСТАЎ»

WWW.BAJ.BY

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права.
Спасылка на ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з'яўляецца абавязковай.
Выдавец: ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» (ГА «БАЖ »).
Вул. Камсамольская 7-32, 220030 Мінск, БЕЛАРУСЬ
Тэлефоны: +375 17 203-63-66, 226-70-98 Факс: +375 17 203-63-66, 226-70-98
E-mail: press@baj.by Web: www.baj.by
Кантакт: Бастунец Андрэй Леанідавіч, намеснік старшыні ГА «БАЖ »